22130019

International Baccalaureate®
Baccalauréat International
Bachillerato Internacional

**BELARUSIAN A: LITERATURE – STANDARD LEVEL – PAPER 1**
**BIÉLORUSSE A : LITTÉRATURE – NIVEAU MOYEN – ÉPREUVE 1**
**BIELORRUSO A: LITERATURA – NIVEL MEDIO – PRUEBA 1**

Wednesday 8 May 2013 (morning)
Mercredi 8 mai 2013 (matin)
Miércoles 8 de mayo de 2013 (mañana)

1 hour 30 minutes / 1 heure 30 minutes / 1 hora 30 minutos

INSTRUCTIONS TO CANDIDATES

- Do not open this examination paper until instructed to do so.
- Write a guided literary analysis on one passage only. In your answer you must address both of the guiding questions provided.
- The maximum mark for this examination paper is *[20 marks]*.

INSTRUCTIONS DESTINÉES AUX CANDIDATS

- N'ouvrez pas cette épreuve avant d'y être autorisé(e).
- Rédigez une analyse littéraire dirigée d'un seul des passages. Les deux questions d'orientation fournies doivent être traitées dans votre réponse.
- Le nombre maximum de points pour cette épreuve d'examen est *[20 points]*.

INSTRUCCIONES PARA LOS ALUMNOS

- No abra esta prueba hasta que se lo autoricen.
- Escriba un análisis literario guiado sobre un solo pasaje. Debe abordar las dos preguntas de orientación en su respuesta.
- La puntuación máxima para esta prueba de examen es *[20 puntos]*.


© International Baccalaureate Organization 2013

https://xtremepape.rs/

*Напішыце літаратурны аналіз толькі **аднаго** з двух дадзеных тэкстаў. У сваім аналізе вы мусіце адказаць на абодва накіравальныя пытанні.*

**1.**

**Літары на мармуры**

– Нам патрэбен Баглай Іван Ахрэмавіч.

– Цю, Іван Ахрэмавіч, ды гэта ж я. – І падаў старому кароценькую, з усохлымі бліскучымі пальцамі руку: – Іван Ахрэмавіч Баглай, халера ясная!

– Помнік мы тут у вас заказвалі, пісалі вам, – пачаў стары. – Вы адказвалі нам. Жонка ў мяне загінула, жонка і маленькі хлопчык, у сорак чацвёртым. Вось сын ад яе жыве… Ён жывы, а брат яго…

– Памятаю, як жа, памятаю, – перабіў Іван Ахрэмавіч. – Вечка Лукер'я…

– Во-во, Лукер'я і Міхась Вечкі…

– Гатоў помнік. Добры помнік. Ой помнік! Першы такі на Палессі, і ваш. Эксперыментальны, халера ясная. Пашэнціла вам, пашэнціла. Во ён, халера ясная.

І Баглай радасна кінуўся да высокай, яшчэ не зманціраванай пліты, шурпатай пасярэдзіне, дзе павінна была стаць мармуровая дошка з надпісам.

– Дошка яшчэ не гатова… Праўдзівей, дошка гатова, ды надпісу няма… А яшчэ праўдзівей, дык і надпіс ёсць, высечаны і літары, толькі іх фарбай, золатам, пакрыць трэба… Мастак наш будуецца і на работу не кожны дзень выходзіць. Але прымусім, прымусім. Будзе, золатам будзе: Вечка Лукер'я Авяр'янаўна, 1918–1944, Вечка Міхась Рыгоравіч, 1942–1944,– амаль з любоўю прапеў Баглай.– А помнік які, вы толькі паглядзіце на гэты помнік. Карцінка. Першы на Палессі, эксперыментальны…

І Баглай зноў кінуўся абмацваць і гладзіць помнік, песціць, як гаспадар кабанчыка перад пакупнікам на базары. І яго сухая, маленькая рука з пакурчанымі бліскучымі пальцамі набыла спрытнасць, як бы ажыла, і амаль лётала па камені. І камень пад яго рукой таксама ажываў.

Віктар Казько, *Сучасная беларуская проза: Традыцыі і наватарства* (2003)

(а) Патлумачце, якая ўнутраная сувязь існуе паміж асобамі, пахаванымі на могілках, і помнікам, што ім робіць майстар?

(б) Якім чынам аўтар будуе тэкст, выкарыстоўвае, напрыклад, форму дыялога і выкарыстоўвае мастацкія сродкі мовы?



https://xtremepape.rs/

**2.**

**Сварогава[1] каханка**

Скруху,
як спосаб удушэньня думкі,
не падару
рупліўцам лукамудрым,
разважлівы развой душы
ахалане[2]
абсяг і недасяжнасьць,
па ім пайду
ў Сварогавы ўладаньні,
ён там мяне чакае,
як вястунку
раскрышанасьці скрушных чуцьцяў.
На воблачным пасадзе
мы з ім зачнем
сьмяшлівае дзіця.
Бязгрэшны гэты плод,
найноўшы наш мэсія,
як громам,
рогатам паб’е
кардоны ў край вясёлы,
тутэйшыя ж,
пазбаўленыя звычнай крыўды,
мяне на вогнішча
за гэта павядуць
і зноў шчасьліва
скруху ў душы ўпусьцяць.

Валяньціна Аксак, *Антычны дождж* (1999)

[1] Сварог: бог старажытных язычніцкіх славян; сынам яго быў Даждзьбог, Бог Сонца
[2] ахалане: абдыме

(а) Гэты верш пабудаваны на кантрастах. Знайдзіце іх, апішыце і патлумачце, з якой мэтай яны выкарыстоўваюцца.

(б) Як паэт карыстаецца вобразнымі сродкамі мовы ў гэтым вершы?



https://xtremepape.rs/